# З ДНЁМ ПЕРАМОГІ, ТАВАРЫШЫ!



# Гомельскі ўніверсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 16 (803) | Аўторак, 7 мая 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.




9 МАЯ 1945 года — дзень нашай Перамогі, дзень усенароднага гонару і ўсенароднага смутку. Дзень заканчэння страшэннай, бязмерна жорсткай вайны. У гэтай навязанай Савецкаму Саюзу германскім фашызмам вайне вырашаліся лёсы першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, сусветнай цывілізацыі.

Савецкі народ і яго доблесныя Узброеныя Сілы нанеслі сакрушальнае паражэнне фашысцкай Германіі, адстаялі ў жорсткай барацьбе з агрэсарам свабоду і незалежнасць сваёй Айчыны, прынеслі вызваленне народам Еўропы.

Перамога ў вайне была заваявана мужнасцю, баявым майстэрствам і гераізмам савецкіх воінаў на палях бітваў, самаадданай барацьбой партызанаў і падпольшчыкаў за лініяй фронту, штодзённым працоўным подзвігам работнікаў тылу, з'яднанымі намаганнямі антыгітлераўскай кааліцыі і антыфашысцкага руху. Радзіма-маці ніколі не забудзе патрыятычных адзяйсненняў савецкіх людзей, якія вынеслі на сваіх плячах суровае выпрабаванне вайны.

У гады Вялікай Айчыннай вайны былі памнажаны гераічныя традыцыі Савецкіх Узброеных Сіл. У адзінаборстве з іх моцным і каварным праціўнікам яны пераканаўча даказалі бясспрэчную перавагу айчыннай зброі, савецкага ваеннага мастацтва, паказалі свету ўзоры воінскай доблесці, самаадданасці і гуманізму.

Вялікія ахвяры прынесены намі ў імя свабоды і незалежнасці нашай Радзімы. Толькі Савецкія Узброеныя Сілы страцілі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (у тым ліку і ў кампаніі на Далёкім Усходзе супраць імперыялістычнай Японіі ў 1945 годзе) забітымі, прапаўшымі без вестак, папаўшымі ў палон і не вярнуўшыміся з яго, якія памерлі ад ран, захворванняў, ад няшчасных выпадкаў, 8 мільёнаў 668 тыс. 400 чалавек.

Самыя цёплыя, шчырыя віншаванні са святам — Днём Перамогі — мы адрасуем 44 былым франтавікам, падпольшчыкам, партызанам, якія стаяць на ўліку ва універсітэцкай ветэранскай арганізацыі. Мы схіляем галовы перад іх гераізмам, мужнасцю, якія яны праявілі ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны, і жадаем ім здароўя, асабістага шчасця яшчэ на доўгія гады.

Сёння ветэраны і прадстаўнікі факультэтаў універсітэта ўскладуць у студэнцкім парку універсітэта вянкі і кветкі да брацкай магілы загінуўшых воінаў і падпольшчыкаў. Для гэтага неабходна сабрацца ў 16.30 каля першага корпуса ГДУ. А вечарам у памяшканні студэнцкай сталовай будзе праводзіцца святочны «Агеньчык», на які запрошаны ўсе ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, якія працуюць ва універсітэце, і хто знаходзіцца на заслужаным адпачынку.

## 100 РУБЛЁЎ У СУТКІ

Такім можа быць ваш заробак, калі вы будзеце супрацоўнічаць з Камерцыйным навукова-вытворчым студэнцкім прадпрыемствам «Арктур».

Як зарабіць такія грошы без урону для вучобы?

Для гэтага вам патрэбна ўмець: прыбіраць кватэру, вымыць акно, пасядзець з дзіцём, фарбаваць, уставіць замок, клеіць абоі, абабіць дзверы, адрамантаваць выключацель, павесіць люстру, паяць, тачыць.

Не ўпусціце свой шанц! Мы чакаем вас ў п. 1-15, галоўны корпус.

## ПАТРЭБНЫ СТУДЭНЦКАМУ КАФЭ

У студэнцкае кафэ універсітэта, якое адкрыецца ў пачатку чэрвеня г. г., на пастаянную работу патрабуюцца: бухгалтар (1) — аклад 200 руб.; адміністратары (2); бармэны (2); швейцары (4); мыйшчыцы пасуды (4); афіцыянты (10); прыбіральшчыцы (2).

Заработная плата — ад 150 да 300 руб. без уліку кампенсацыі і індэксацыі.

За даведкамі звяртацца ў камітэт камсамола ГДУ (п. 1-15, тэл. 57-16-45).

*Па слядах нашых выступленняў*

## ЛЁС АДКРЫТАГА ЛІСТА

У выключна цяжкім становішчы апынуліся на сённяшні дзень ВНУ Гомельшчыны. Прычын некалькі. Назавем асноўныя. Першая — вынікі чарнобыльскай трагедыі. Пасля яе пачаўся прыкметны адток кадраў, пераважна высокай кваліфікацыі, у экалагічна бяспечныя рэгіёны рэспублікі і краіны. Месца прапіскі змяніла амаль трэць выкладчыкаў, сярод якіх значны працэнт займаюць доктары і найбольш здольныя кандыдаты навук. У данай сітуацыі вартай ім замены падабраць практычна немагчыма. У прафесарска-выкладчыцкім корпусе вышэйшай школы вобласці ўзнікае ўсё больш вакансій. А пры знявечаным арганізме любой ВНУ рыхтаваць спецыялістаў, якія б па ўсіх параметрах адпавядалі высокім сучасным патрабаванням, — надзвычай складана.

Другім штуршком для развалу вышэйшай школы, асабліва пасля, як кажуць, касмічнага павышэння розничных цэн, стала рэзкае зніжэнне жыццёвага ўзроўню работнікаў ВНУ.

Марудна і вельмі слаба паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічная база вышэйшай школы.

Шмат сваіх праблем сёння і ў студэнцтва.

Крызісная абстаноўка, якая можа прывесці да краху і вышэйшую школу, не можа не непакоіць. Не выпадкова выкладчыкі і супрацоўнікі эканамічнага факультэта звярнуліся з адкрытым лістом (надрукаваным у нашай шматтыражцы за 19 сакавіка г. г.) да народных дэпутатаў БССР Б. П. Савіцкага, А. В. Саснова і Л. Н. Сечкі (першыя двое — старшыні пастаянных камісій, члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР), якія раней працавалі ў ГДУ. Мэта звароту — аказанне з боку нашых выбраннікаў вышэйшага органа ўлады хоць якой-небудзь дапамогі (не пабаюся гэтага слова) для выратавання вышэйшай школы Гомельшчыны.

У рэальнасці ж, у даным выпадку, чаканні універсітэцкіх эканамістаў аказаліся дарэмнымі. Спачатку ва універсітэт прыязджаў у недалёкім былым яго прарэктар, які і вылучыўся кандыдатам у народныя дэпутаты БССР калектывам ГДУ, Л. Н. Сечка. Мне давялося пагутарыць з ім асабіста. Леанід Нікanоравіч азнаёміў мяне з падрыхтаваным ім на імя прэм'ер-міністра рэспублікі В. Ф. Кебіча прадстаўленнем, у аснову якога леглі просьбы калектыву эканамічнага факультэта ГДУ. Аднак гэты дакумент далейшага ходу не атрымаў. Маўляў, у дзяржаўнай казне пуста, і калі кіраўнік урада рэспублікі спытае, з якіх крыніц узяць дадатковыя сродкі на вышэйшую школу, у прыватнасці, Гомельшчыны, не знойдзем на гэта адказу.

Што гэта за пазіцыя, няхай мяркуюць чытачы.

Затым універсітэт наведаў А. В. Сасноў — адзін з першых выпускнікоў эканомфака і аспірантуры кафедры эканомікі працы, дзе пэўны час працаваў выкладчыкам, дацэнтам. Размова з ім ішла, як кажуць, па-свойску. З вялікай увагай прысутныя на сустрэчы слухалі расказ Аляксандра Віктаравіча аб рабоце парламента рэспублікі і ўзначальваемай ім камісіі па пытаннях працы і цэн, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва, аб растаноўцы сіл у Вярхоўным Савеце БССР.

А. В. Сасноў стараўся быць аб'ектыўным, наконт усяго выказваў асабістыя меркаванні і прагнозы. На яго думку, у бліжэйшыя месяцы змяненняў да лепшага не адбудзецца. Наадварот, сітуацыя можа яшчэ больш абвастрыцца і накаліцца. Але ні забастоўкі, ні мітынгі ў рабочы час становішча не выправяць. Гэтага можна дасягнуць толькі на аснове ўзаемаразумення, у выніку самаадданай працы.

Калі ж гаворка закранула канкрэтнае пытанне — якая рэакцыя народных дэпутатаў БССР на адрасаваны ім адкрыты ліст, у аўдыторыі закіпелі страсці. Спрачаліся ледзь не да хрыпаты. І няма сэнсу пераказваць усё пачутае. Сутнасць сцвярджэнняў А. В. Саснова ў адным: бюджэт рэспублікі ў вялікім дэфіцыце, трашчыць па швах. Кожны толькі думае, каб больш узяць, а аддаць — як давядзецца. Таму дадатковых асігнаванняў на вышэйшую школу, акрамя прадугледжаных раней, у бліжэйшы час не прадбачыцца. Таму, як прызнаўся А. В. Сасноў, ён і адмовіўся падпісаць падрыхтаванае Л. Н. Сечкам прадстаўленне па адкрытаму лісту калектыву эканамічнага факультэта.

Што ж, там, у Вярхоўным Савеце, урадзе рэспублікі лепш бачна, наскольні абмяшчала наша агульная рэспубліканская каса. Тады як жа разумець пастанову пленума Савета УКП СССР «Аб бягучым моманце і тактыцы дзейнасці прафсаюзаў», прынятую ў красавіку, у якой пастаўлена патрабаванне на працягу года павысіць заработную плату рабочых і служачых ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі не менш чым у 1,7—2 разы?

**Ул. ВАЛОГА.**

# СЁННЯ — ДЗЕНЬ РАДЫЁ

27 сакавіка 1926 года на пасяджэнні прэзідыума Гомельскага губвыканкома быў прыняты акт прыёмкі Гомельскай радыёстанцыі, якая ўвайшла ў састаў акцыянернага таварыства «Радыёперадача».

Першая радыёстанцыя была магутнасцю 1,2 квт і не зусім магла задаволіць патрэбу ў радыёкропках, таму 31 сакавіка 1926 года прэзідыум губвыканкома рашае ўстанавіць, у першую чаргу, радыёпрыемнікі ў сельскіх Саветах Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. На ўстаноўку радыёпрыёмнікаў у гэтых паветах адпускалася 20 тыс. руб. Пры гэтым, каб паскорыць устаноўку радыёпрыёмнікаў павятовым і валасным выканкомам, выдавалася адна трэцяя затрачанай сумы са сродкаў губвыканкома. Аднак устаноўленыя прыёмнікі коштам 25 рублёў не апраўдалі сябе, таму шэраг выканкомаў прапанавалі змяніць фінансаванне. У прыватнасці, старшыня Рэчыцкага павятовага выканкома Шаршнёў у дакладной запісцы на імя губвыканкома паведамляе: «Прэзідыум УІКА лічыць больш мэтазгодным правесці ўстаноўку радыёапаратаў коштам у 105 руб., каб больш ці менш даць магчымасць сельсаветам на самой справе атрымліваць карысць і хадайнічаць аб павелічэнні адпускаемай сумы ў размеры да 19 тыс. руб.».

Устаноўка радыёпрыёмнікаў праводзілася ў хатах-чытальнях пры ўмове наяўнасці 50% сабраных сродкаў насельніцтвам на радыёўстаноўку.

Перадачы па радыё вяліся на працягу 2,5—3 гадзін і не раней 20 гадзін 30 мінут, таму што з гэтага часу пачыналася падача электраэнергіі.

На радыё выступалі з лекцыямі работнікі губздрава, калегіі абаронцаў, губземупраўлення. У распараджэнне радыёстанцыі была перададзена левая ложкыя ў тэатры імя Калініна, з якой вяліся трансляцыі пастановак.

Акрамя гэтага канцэрты арганізоўваліся і непасрэдна ў студыі. Аб гэтым сведчаць звароты членаў акцыянернага таварыства «Радыёперадача» да старшыні губвыканкома т. Ягорава з просьбай дапамагчы набыць новы раяль.

У сувязі з тым, што патрэба розных устаноў і арганізацый у тэрміновых цыркулярных зносінах з павятовымі, акружнымі, валаснымі і раённымі органамі ўзрастала, планавалася ўстанавіць у аддзяленнях і агенцтвах прыёмныя радыёстанцыі. З гэтай мэтай было праведзена анкетаванне, якое спачатку было не на карысць радыёсувязі. Але затым колькасць прыхільнікаў радыё пачала расці.

Адначасова, у тэрміновым парадку, вядуцца работы па будаўніцтву тэлеграфных ліній у напрамку Свяцілавіч, Пятроўскай Буды, Васільеўкі, Рэчыцы, Брагіна, Лоева. 1 да кастрычніка 1926 года ў г. Гомелі і ў паветах ствараецца «Таварыства сяброў радыё», якое аб'яднала гурткі радыёаматараў. Члены таварыства стварылі сваю бібліятэку-чытальню, радыёкуток, тэхнічную лабараторыю. Яны дапамагалі матэрыяльна акцыянернаму таварыству «Радыёперадача», штодзённы бюджэт якога складаў 6 рублёў, хаця неабходны мінімум быў 20 руб.

Работай акцыянернага таварыства кіраваў савет радыёвяшчання, які займаўся пытаннямі пастаўкі радыёапаратуры, арганізацыяй курсаў па радыё. Спачатку ён функцыяніраваў пры аргаддзеле Гомельскага губвыканкома, а затым пры губпалітасвеце.

З часам акцыянернае таварыства «Радыёперадача» перайшло ў падпарадкаванне ведамства сувязі, якое абавязалася дабудоўваць і развіваць шырокавяшчальную радыёстанцыю.

**М. АЛЕЙНІКАВА,**
**ст. н. с. абласнога архіва.**

# ЦІ ЎМЕЕЦЕ ВЫ ПРАВОДЗІЦЬ ВОЛЬНЫ ЧАС?

У кожнага бываюць такія мінуты, калі ўсё здаецца сумным, няма куды сябе падзець, і час цягнецца бясконца доўга. У адных людзей гэта бывае часцей, у другіх радзей. А ёсць такая катэгорыя людзей, якім сумна не бывае ніколі. Яны заўсёды знойдуць, як выкарыстаць свой вольны часа. А вы ўмееце не траціць час?

1. Ці здаецца вам, што водпуск занадта кароткі?
2. Ці бывае так, што вам няма чым сябе заняць?
3. Гуляючы з сябрамі, ці спыняецеся вы ад таго, што вам стала сумна?
4. Калі вы з сябрамі, хто ініцыятар усіх гульняў — вы?
5. Ці ведаеце вы хаця б чатыры віды настольных гульняў?
6. Ці любіце проста хадзіць без мэты?
7. Вы любіце чытаць?
8. Вы што-небудзь калекцыяніруеце?
9. Ці вядзеце вы дзённік?
10. Ці любіце вы рашаць красворды?
11. Ці лічыце вы дождж у выхадныя дні катастрофай?
12. Калі вы чакаеце каго-небудзь або чаго-небудь, ці ўмееце вы сябе заняць, каб не чэрвавацца?

Адно ачко вы атрымаеце за адказ «так» на пытанні 1, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 12 і адно ачко за адказ «не» на пытанні 2, 3, 11.

А цяпер падлічыце.

**У вас больш васьмі ачкоў.** Што ж, вы ўмееце праводзіць вольны час. Вашы таварышы з вамі ніколі не сумуюць, ды і вам самому не ўласцівы сум. Такой якасці можна толькі пазайздросціць.

**Ад 4 да 8 ачкоў:** у вас, як і ў большасці людзей, бываюць дрэнныя дні, калі нічога не атрымліваецца, нішто не цікавіць. Вы ведаеце, напэўна, нядрэнна мець у запасе якое-небудзь захапленне, якое ў любым становішчы можа выправіць хоць крыху настрой.

**Менш 4 ачкоў:** калі вы шчыра адказалі на пытанні і вас на самой справе нічога не цікавіць — паназірайце за тымі, хто ўвесь час заняты, і вы навучыцеся захоўваць сваё здароўе.

Спорт

# АРЛІНЫ ЎЗЛЁТ КОРШУНА

Завуч школы вышэйшага спартыўнага майстэрства Сяргей Ціханавіч Цынгалёў так сказаў пра Сярожу Коршуна. Хай будзе ў гэтым гіпербала, але ж яна да месца. Цынгалёў ведае майстра спорту СССР Коршуна з маленства, з пятага класа.

— Такіх бы пабольш, — Сяргей Ціханавіч памаўчаў. — З такімі, як Коршун, працаваць — любата. Дысцыпліна і самадысцыпліна для іх — рэчы святыя. Гэта, уласна кажучы, сутнасць характару моцных натур.

У парушэнне існуючага палажэння Сяргей Коршун да васемнаццаці гадоў стаў майстрам спорту. Можа, слова «стаў» не зусім падыходзіць. Можна стаць на п'едэстал пераможцы, п'едэстал гонару, а вось загады на самога сябе напісаць нельга. Майстрам стаў таму, што інакш быць не магло. Коршуна ведае краіна. Ён бачыў у свае юнацкія гады Францыю, Польшчу, Германію. У Парыжы заваяваў залаты медаль. Без узнагарод, дыпломаў ён не вяртаўся дадому, і бацька Мікалай Аляксеевіч, часцей за ўсё моўчкі гледзячы на сына, свае пачуцці выказваў позіркам — дабразычлівым, лагодным і шчырым: ён ганарыцца сынам.

Ганарыцца Сяргеем і заслужаны трэнер БССР Віталь Аляксандравіч Грудцын. Умее вучань усё разумець з паўслова. А калі сказаць, што і рабіць умее тое, што выпрацавалі на трэніроўках, — пра такога вучня марыць ды марыць трэба.

Марыць трэнер і вучань пра новыя спартыўныя вышыні. Можа, чарговая вышыня скарыцца Коршуну ў Кіеве, дзе ён удзельнічае ва Усесаюзным юнацкім першынстве па пяцібор'ю.

Прыгожы гэта спартыўны комплекс. Трэба фехтаваць, як гэта рабілі лепшыя гладыятары, страляць як варашылаўскаму стралку, бегаць, каб вецер не дагнаў, плаваць імклівай рыбінай. Усё гэта патрабуе гарманічнага фізічнага развіцця.

Знарок канкур — пяты від — апусціў. Хачу сказаць пра гэты від пяцібор'я асобна. Мне давялося бачыць трэніроўку Сяргея. Адзін з тых, хто стаяў побач са мною, сказаў:

— Коршун ляціць.

У гэтым была доля праўды. Сяргей, рост якога 182 сантыметры, здавалася, зліўся са скакуном, і той, ледзь датыкаючыся стромкімі нагамі долу, імкліва ляцеў да фінішу. Там, саскочыўшы з сядла, падышоў да галавы каня, крануў яе далонню, і той узяў кавалачак цукру: ноздры ягоныя сталі дыхаць менш натужна.

Нядаўна Сяргей вярнуўся з Латвіі, дзе прымаў па персанальнаму запрашэнню ўдзел у юнацкім першынстве гэтай рэспублікі. Там сабраліся ўсе сябры-сапернікі краіны. Другое месца не засмуціла Коршуна: кожнае спаборніцтва — школа. Не кожную школу можна скончыць з залатым медалём.

Школу вышэйшага спартыўнага майстэрства Сярожа скончыў добра. Наспеў час выбару: ён быў на ростанях жыцця. Выбраў дарогу, якая прывяла яго на факультэт фізічнай культуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны. Першы курс, як першы старт. І тут Коршун верны сабе: вучоба і спорт — галоўны сэнс кожнага пражытага дня.

Не ведаю, ды і не трэба загадваць будучыню юнака. Адчуваецца і бачна, што з добрага спартсмена, грамадзяніна у якога ўжо ў няпоўныя васемнаццаць актыўная жыццёвая пазіцыя, будзе добры трэнер, і ягоныя вучні змогуць узяць вышыні, вышэй тых, якія скарыліся і скорацца Коршуну: ён кандыдат у зборную СССР. Туды бяруць моцных.

Вось гэтай моцы і жадае Мікалай Аляксеевіч свайму сыну. Жадае і ганарыцца ім.

**Мікола ДУБАВЕЦ.**



На здымку: першыя вясновыя кветкі — пралескі.

Фота А. Коваля.

## І. Р. ТРАФІМОВІЧ — СУДДЗЯ УСЕСАЮЗНАЙ КАТЭГОРЫІ

**Дзяржкамспорт СССР прысвоіў групе суддзяў з Беларусі высокую кваліфікацыю — «Суддзя Усесаюзнай катэгорыі». Яе ўдастоены па лёгкай атлетыцы загадчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту нашага універсітэта Іван Рыгоравіч ТРАФІМОВІЧ.**

## СЛУЖБА НТІ ІНФАРМУЕ

Аддзел навуковых публікацый навукова-вытворчага цэнтра «Верас» і Інстытута заалогіі АН БССР дэпаніруе і распаўсюджвае навуковыя артыкулы па біялогіі, эканоміі, геаграфіі і сумежных з імі навуках.

Дэпаніраванне платнае: старонка — 18 кап., табліца — 20 кап., схема, фатаграфіі — 25 кап.

На дэпаніраванне прадстаўляецца аддрукаваны рукапіс артыкула—1 экз., накіраванне ГДУ, рэферат — 1 экз.

Аддзел навуковых публікацый выплачвае аўтарам 10% кошту кожнай копіі іх артыкулаў.

За больш падрабязнай інфармацыяй звяртацца да адказнай за дэпаніраванне — інжынера Т. Яромінай (галоўны корпус., п. 2-28, НДС).

## НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

Слова май або маій зайшло да нашых бацькоў з Візантыі. Карэнныя славянскія назвы гэтага месяца былі іншымі. Нашы продкі называлі яго травень, траўны. Чэхі і славакі — квецень або цвецень. Сербы — ражалоні, майскі. У старым рускім жыцці май лічыўся трэцім пралётным месяцам, а калі год лічылі нашы продкі з верасня, тады ён лічыўся дзевятым. З 1700 года па ліку ён прыходзіцца ўжо пятым.

# У НАРОДЗЕ КАЖУЦЬ

◆ У маі добрыя людзі не жэняцца.
◆ Рад бы ажаніцца, ды май не дазваляе.
◆ Хто ў маі жэніцца, той будзе век маяцца.
◆ Захацеў ты ў маі дабра.
◆ Жыві, весяліся, ды як жа табе будзе ў маі.
◆ Наш панамар паспадзяваўся на май, ды без каровы стаў.
◆ Калі сакавік сухі ды мокры май, дык будзе каша і каравай.
◆ Майская трава і галоднага корміць.
◆ Дарма, што салавей птушка малая, а ведае, калі май.
◆ Ай, ай, месяц май: не холадна, дык голадна.
◆ Калі ў маі дождж, дык будзе і жыта.
◆ Май халодны — год хлебародны.
◆ У маі нарадзіцца, увесь век прамаяцца.
◆ Халодны май — шмат сена, мала хлеба. Частыя громы — да багацця. Вялікія громы знамянуюць цяжкі час для жывёлін. Калі да канца месяца дажджліва, то хлеба будзе мала. Калі ў маі гусі ляцяць высока, то авёс будзе высокім; калі нізка, то авёс будзе нізкім.

Вільгаць, дажджы ў маі — з холадам або цяплом, што амаль аднолькава, — складаюць найлепшую прыкмету, прыносяць благаславенне палям, абяцаюць найлепшы ўраджай, але могуць быць шкоднымі для пладоў, асабліва для вінаграду.

Найбольш важнымі для сельскага жыцця днямі ў маі, да якіх прымеркавана вялікая колькасць назіранняў і прыкмет, з'яўляюцца: Ніколін дзень — 9 мая; даволі важнымі ўказальнікамі надвор'я лічацца 1 мая — Яромін дзень, 11 мая — Макееў дзень, 14 мая, які лічыцца пераходным днём ад вясны да лета (прайшлі Сідоры —прайшлі і сіверы), і 15 мая — св. Пахома, які летнім цяплом пахне. У маі заканчваецца сяўба яравых хлябоў, адбываецца развіццё карнявой сістэмы раслін, а з 29 мая — Фядосьі-Каласяніцы — пачынаецца і каласэнне хлеба.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне юрысконсульту ГДУ РУПІНУ Віктару Міхайлавічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — трагічнай смерцю СЫНА.**

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины, Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па друку, Гомель, Савецкая,1.

Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 1500 экз. Заказ 319. Падпісана да друку ў 14.00.